УДК 82.091

**І. С. Крыштоп**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВЯСНОВЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ КАНСТАНЦЫІ БУЙЛО І ЛЮЙ ЦЗЯНЯ

**Уводзіны.** Адметнасць таго ці іншага персанальнага мастацкага бачання свету выразна выяўляецца, калі яго прадметам абраць нешта больш-менш стабільнае для ўсіх паэтаў. Матывы ў паэзіі «найбольш непасрэдна, чым іншыя кампаненты мастацкай формы, суадносяцца са светам аўтарскіх думак і ўяўленняў» [7, с. 7], таму іх вывучэнне можа быць асабліва плённым. Больш таго, кожная нацыянальная літаратура мае «сваю сістэму ўпадабаных, устойлівых матываў» [10], якія характарызуюць яе эстэтычную своеасаблівасць. Таму аналіз паэтычных матываў важны і як прыём рэканструкцыі мастацкага мыслення паэта — прадстаўніка нацыянальнай літаратуры.

Самастойнае вывучэнне асобных матываў дазваляе ацаніць мастацкі свет творцы, а ў сукупнасці яны «атрымліваюць дадатковыя эстэтычныя магчымасці» [6, с. 10] — адкрываюць нюансы мастацкіх сэнсаў. Аднак адзін і той жа матыў, захоўваючы сваю сэнсавую сутнасць, можа абнаўляцца ў розных гісторыка-літаратурных кантэкстах, набываць розныя сімвалічныя значэнні

© Крыштоп І. С., 2019



Репозиторий БарГУ

ў творах эпохі, г. зн. падкрэсліваць блізкасць і ў той жа час арыгінальнасць аўтараў. Такім чынам, выкарыстанне матыву як катэгорыі параўнальнага літаратуразнаўства дазваляе выявіць індывідуальную, нацыянальную ці гістарычную спецыфіку мастацкага твора.

**Асноўная частка.** Важную ролю ў мастацкім свеце кожнага аўтара адыгрывае сезонная дыферэнцыяцыя пейзажаў. Гэта, з аднаго боку, сведчыць пра ўвагу творцаў да асноватворных праблем быцця, адвечнай мудрасці і ўспрыманне чалавека як часткі светабудовы, з другога — з кожнай парой года звязаны «адметны комплекс выяўленчых сродкаў, закліканых увасобіць той ці іншы тып эстэтычнага перажывання і прыдатных для акцэнтавання ўвагі на складаных, тонкіх стасунках чалавека і навакольнага прыроднага свету» [10].

Традыцыйна вясна лічыцца асаблівай парой года, якая выклікае прыліў жыццёвых сіл і душэўнага хвалявання, адбываецца адраджэнне прыроды да жыцця і росквіту. Такое ўспрыманне і разуменне вясновага часу мы знаходзім у творах прадстаўніцы беларускай літаратуры К. Буйло. Паэтэса любіць жывы, дынамічны, зменлівы свет. Гэтае пачуццё напаўняе яе творы матывамі чакання, абнаўлення і веры.

Асаблівасцю вясновай метафорыкі К. Буйло ў зборніку «Курганная кветка» з’яўляецца тое, што душэўны стан лірычнай гераіні зліты са станам прыроды: «Твары радаснай усмешкай, / Шчасцем увяснелі…» [4, с. 13]. Вясна ачалавечваецца паэтэсай, уяўляецца дзівоснай жывой істотай, што прачынаецца разам з іншымі. Гэтая пара года ўспрымаецца і як перамога жыцця над смерцю. Між тым, у вершы «Пралеска» К. Буйло ўказвае на далікатнасць і кволасць першых веступоў вясны: «А сіняе вочка пралескі / Адважна на сонца глядзіць. / Чаго ж паспяшалася кветка, / Хавайся ў зямлю ты глыбей, / у нас тут зіма йшчэ пануе…» [2, с. 16].

У беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя асаблівую папулярнасць набылі «веснавыя гуканні». П. В. Васючэнка адзначае, што «персаніфікаваны вобраз Вясны служыў у творах-закліках адменнікам нацыянальна-адраджэнцкага абуджэння, пасіянарнага ўсплёску» [5]. Заклік да дзеяння, што гучыць у іх, сведчыў пра неабходнасць пераўтварэння рэчаіснасці, пераадолення грамадскай і нацыянальнай апатыі. Такім чынам, вясновыя матывы ў беларускай літаратуры па сваіх пафасе і ідэях



Рэпазіторый БарДУ

адпавядалі неарамантычнаму пратэсту супраць дэгуманізацыі асобы, якая імкнулася да перабудовы грамадства праз змаганне з ханжаствам і крывадушнасцю, паказ сваіх узвышаных ідэалаў.

Тэмы свабоды, нацыянальнага адраджэння або заклік да абуджэння, вера ў шчаслівую будучыню ў спалучэнні з сацыяльнай праблематыкай у пэўнай меры выявіліся і ў прасякнутых матывам вясны вершах К. Буйло: «Вясна ўзнімецца над краем! / Сплыве мой боль — як бурна ў маі / Сплывае чорная вада»; «І зноў ў чароўны край прадвесні / Мчыць душу дзіўны спеў!..» [3, с. 15, 17]. Услаўленне хараства вясны ў лірыцы беларускага аўтара таксама злучаецца з радаснымі ўспамінамі пра дзяцінства: «З лет даўнейшых маіх помню дзень я адзін: / Вясна была…» («Памятны дзень») [1, с. 19].

Аднак, апяваючы хараство нацыянальнага краявіду, беларуская паэтэса не столькі апісвае яго як ідэальнае асяроддзе існавання чалавека, колькі праз катэгорыю прыгожага/ідэальнага ў вясновай прыродзе выяўляе яе неадназначныя стасункі з сацыяльнай рэчаіснасцю, г. зн. акцэнтуе кантраст паміж гарманічнасцю прыроды і дысбалансам у соцыуме. К. Буйло звяртаецца да асобнага чалавека як пасярэдніка паміж імі і засяроджвае ўвагу на яго каштоўнасных арыенцірах. Пры гэтым душэўны стан лірычнай гераіні і стан прыроды, як правіла, у вышэйшай ступені злітыя: вызначыць, што да чаго прыпадабняецца, амаль немагчыма: «Ў выццё тваё, вецер, зліла б мае стогны, / І выў бы ты болем маім, — / Мо сэрца людское спагадаю дрогне / Над болем вялікім такім» [4, с. 22].

Тэма прыроды і чалавека вельмі характэрная і тыповая для кітайскай літаратурнай творчасці. Ужо ў найстаражытны перыяд у кітайцаў ясна прасочваецца цесная сувязь вобразнага мыслення з прыродай, якая паўстае жывымі карцінамі рэк і гор, бясконцай шматстайнасцю раслін і колераў. У гэтым знаходзіць адлюстраванне ўласцівая кітайскаму народу думка, што існаванне людзьмі на зямлі звязана з навакольным светам. У XX стагоддзі ў якасці перадумовы, а потым і асноўнага тэзісу развіцця паэзіі была выкарыстана думка Мао Цзэдуна пра тое, што трэба «развіваць новую паэзію на грунце народных песень і класічнай паэзіі» [9]. Адпаведна, тэма прыроды і прыродныя матывы засталіся запатрабаванымі.

Пошук сэнсу жыцця і гармоніі абумовіў зварот Люй Цзяня да тэмы прыроды як іх асноўнай крыніцы і сховішча, таму разам з апісаннямі мясцін, добра вядомых з дзяцінства, у яго вершах ствараюцца топасы, адцягненыя ад пэўнага геаграфічнага



Репозиторий БарГУ

становішча: «Калі ты вясной зачараваны, / Згаснуць безнадзейнасці туманы. / Калі ты з людзьмі душой і целам, / Ты да іх прарвешся з сэрцам смелым» [8, с. 149]. Кітайскі аўтар падкрэслівае супярэчлівую сутнасць самога прыроднага свету: з аднаго боку, прырода — пачатак, які прымірае, гарманізуе быццё, з другой — сіла, што натхняе чалавека, сваёй непазнавальнасцю, неабсяжнасцю і нават празмерным хараством садзейнічае яго самапазнанню.

У лірыцы кітайскага аўтара супярэчлівасць прыроды праецыруецца на пачуцці лірычнага героя. Яны змяшчаюць даволі шырокі спектр: ад расчаравання да захаплення, што, у сваю чаргу, сведчыць пра адметнасць асабовага ўспрымання супярэчлівага стану эпохі, у рамках якой адбывалася станаўленне і развіццё Люй Цзяня як творцы. Напрыклад, лірычнае перажыванне ў вершах «Радзіма» і «Адказ» злучана з вобразам чалавека, які адначасова адчувае гонар і жах ад магчымасці быць цалкам паглынутым хараством жыцця. Прыродныя з'явы ў дадзеным выпадку апісаны як сіла, што здольна дапамагчы чалавеку «акрыяць» [8, с. 149], знайсці сваю індывідуальнасць. Прыроднае хараство як абстрактная субстанцыя супрацьпастаўлена фізічнаму стану лірычнага героя — канкрэтнаму і рэальнаму. У выніку краявід, адлюстраваны ў творах, пачынае выконваць канцэптуальную функцыю: са звычайнага фону ён ператвараецца ў паўнапраўны сродак увасаблення ідэі паўнаты быцця.

Прырода ў творах Люй Цзяня таксама набывае «дзіўныя» ўласцівасці: яна здольна ачышчаць чалавека або далучае яго да вечнай светабудовы. Напрыклад, у вершы «Маё ўспрыманне жыцця» падаецца разгорнутае апісанне стану лірычнага героя ў параўнанні з прыродным светам: «Ды калі вясною кветцы быць — / Ветразь лёсу мне загадаў жыць; / Ды калі слязам чыімсьці ліцца — / Ветразь лёсу нёс праз навальніцы» [8, с. 149]. З аднаго боку, вясна захоўвае экзістэнцыйную сутнасць і дапамагае выказаць думкі пра сутнасць жыцця, з другога — робіцца важным сугестыўным знакам перамен, што адбываюцца ў роднай краіне.

Звяртае на сябе ўвагу незвычайная выразнасць думкі, празрыстая прастата фарбаў і выяў, узятых паэтам з самой прыроды. Адгэтуль і натуральнасць маўленчых выяўленчых сродкаў, паэтычнай лексікі, даступнасць мовы паэта. Гэта асабліва відавочна прадэманстравана ў вершах «Помнік невядомаму герою» і «Радзіма», дзе ў створанай выяве знявечанага, аднак квітнеючага саду ўвасабляюцца думкі паэта пра будучыню і сцвярджаецца «права жыць» [8, с. 149].



Репозиторий БарГУ

**Заключэнне.** Матыў вясны набывае фактычна адзінае значэнне ў мастацкім свеце і К. Буйло, і Л. Цзяня. Іх «вясновая» лірыка аптымістычная: у ёй сцвярджаецца ідэя цудоўнай будучыні, у якой ёсць месца і шчасцю, і свабодзе. Матыў вясновага адраджэння дапамагае аўтарам перадаць самае галоўнае адчуванне — радаснае прыманне навакольнага свету — і выказаць надзею на станоўчыя змены як у асабістым, так і нацыянальным жыцці. Паэты таксама дэманструюць спробу вытлумачыць амбівалентнасць існуючага праз назіранне за цыклічнасцю прыродных працэсаў, таму відавочным становіцца пераход ад бачнага да сутнаснага, калі на першы план выходзяць думкі пра бесперапыннасць развіцця, пераемнасць усяго жывога: асобны індывід эфемерны, але прырода вечная ў сваёй паўтаральнасці. У святле дадзенай дыялектычнай канцэпцыі па-новаму трактуецца і праблема хуткацечнасці і марнасці жыцця. Творцы сцвярджаюць, што зямное існаванне — гэта аснова заўсёднага абнаўлення, а цякучасць часу — перадумова развіцця і ўнутранай гармоніі.

### Спіс цытуемых крыніц


1. *Буйло, К.* Выбраныя творы: у 2 т. / К. Буйло. — Мінск : Маст. літ., 1981. — Т. 1 : Вершы, паэма. — 302 с.
2. *Буйло, К.* Коціцца рэха / К. Буйло ; уклад. і прадм. Д. Чаркасавай. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 287 с.
3. Буйло, К. Курганная кветка : вершы, драматычныя паэмы (факсімільнае выданне) / К. Буйло. — Мінск : Маст. літ., 1989. — 89 с.
4. *Буйло, К.* Пялёсткі курганнай кветкі : вершы / К. Буйло ; укл. і прадм. В. Шніпа. — Мінск : Маст. літ., 2007. — 95 с.
5. *Васючэнка, П.* Беларуская экалітаратура : ад старажытнасці да першай паловы ХХ стагоддзя [Электронны рэсурс] / П. Васючэнка // Беларускі калегіюм. — Рэжым доступу: http://bk.baj.by/lekcyji/ litaratura/vasuchenka_03.htm/ — Дата доступу:10.03.2013.
6. *Жук, І. В.* Матыўная спадчына лірыкі Янкі Купалы: стан і перспектывы / І. В. Жук // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. арт. / рэдкал.: Д. М. Лебядзевіч (адк. рэд.) [і інш.]. — Гродна : ЮрСаПрынт, 2015. — С. 8—18.
7. Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя : манаграфія / І. В. Жук [і інш.] ; пад рэд. І. В. Жука ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Грод. дзярж. ўн-т імя Я. Купалы. — Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2009. — 255 с.
8. Пялёсткі лотаса і хрызантэмы : сто паэтаў Кітая ХХ стагоддзя / уклад. А. Карлюкевіч ; пер. з кіт. М. Мятліцкага. — Мінск : Маст. літ., 2018. — 337 с.
9. *Тугулова, О. Д.* Поэтическая судьба КНР в эпоху Мао [Электронный ресурс] / О. Д. Тугулова // Современная филология : материалы Междунар.


Репозиторий БарГУ

науч. конф. (г. Уфа, апр. 2011 г.). — Уфа : Лето, 2011. — Режим доступа: https://moluch.ru/conf/phil/archive/23/508. — Дата доступа: 19.03.2019.

10. *Эпштейн, М.* Природа, мир, тайник вселенной…: система пейзажных образов в русской поэзии [Электронный ресурс] / М. Эпштейн. — Режим доступа: http://www.nvkz.kuzbass.net/dworecki/other/e/3/om_kp.htm. — Дата доступа: 12.01.2010.

Репозиторий БарГУ